Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

СЯЛЯНСКАЯ ПРАЎДА

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Цана асобнага нумару 20 грош.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12, п. 6.** (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Падпіска на **адзін месяц** з дастаўкай да хаты **2 зл.** Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шп.

№ 13. Вільня, Серада, 29-га кастрычніка 1924 г. Год I.

Першы крок.

Здаецца, йшчэ так нядаўна ўсё польскае грамадзянства Заходняе Беларусі згодным хорам „галасіла“, што гэты край—неаддзялімая частка Польшчы і павінен быць далучаны да яе „бяз ніякіх засьцярогаў“ — без намёку нават на аўтаномію,—а вось, цераз трычатыры гады „чыста польскае“ гаспадаркі, жыцьцё шмат „астудзіла“ гэныя цэнтралістычныя імкненьні.

І характэрна, што першыя спасярод тутэйшых палякоў ясна і выразна загаварылі аб патрэбе *аўтаноміі* для нашага краю — „нашы“ абшарнікі вустамі свайго органу „Słowo“. Дый ня дзіва: замест спадзяванага „раю“ яны ўбачылі адно толькі валізарныя цяжары, якіх вымагае польская „Ojczyzna“, каторая прыйшла не карміць і адбудовываць зруйнаваную вайной Заходнюю Беларусь, а „даіць“ і распрадаваць яе дабро—лясы на паправу польскага скарбу....

Адначасна пачала варушыцца тутэйшая польская працуючая інтэлігенцыя: польскі ўрад заліў наш край рознымі „прыводнымі“ — часта зусім ні да чаго ня здатнымі дома—галіцыйскімі чыноўнікамі, настаўнікамі і паліцыянтамі, адсоўваючы на другі плян тутэйшых палякоў, так шчыра крычаўшых: „do Polski! do Polski!“.... І сярод гэтае краёвае інтэлігенцыі ўсё больш крапчэе думка, што ей ня будзе тут жыцьця, калі Заходняя Беларусь не здабудзе магчымасьці жыць болей-меней *самастойным жыцьцём.*

Далей загаварылі працоўныя нашага краю. І пад той час, як польскія сацыялісты нешта мляўка мармочуць аб аўтаноміі „Крэсаў“, дзелючы іх на некалькі кускоў—дзеля лягчэйшага апалячываньня, камуністычныя арганізацыі зусім выразна гавораць аб патрэбе даць нашаму краю магчымасьць *вольнага самавызначэньня*, ў кірунку поўнага аддзяленьня ад Польшчы і злучэньня з Усходняй Беларусяй.

Усе гэтыя настроі і палітычныя лёзунгі, бязспрэчна, *выяўляюцца ў яшчэ больш яркай форме сярод саміх беларусаў.* Але мы адзначаем эвалюцыю ў паглядах перш за ўсё ў галовах тутэйшых палякоў (ведама, менш падлягаючым шалу нацыяналізму!), бо той факт, што іх пагляды так рэзка зьмяніліся ў працягу некалькіх гадоў, найлепш сьведчыць аб *жыцьцёвасьці і актуальнасьці* пытаньня аб форме істнаваньня Заходняе Беларусі, як асобнае палітычнае адзінкі.

Да прыведзеных галасоў палітычна думаючых груп грамадзянства нашага краю гожа дадаць голас зусім не палітыкаў, а самаўрадавых польскіх дзеячоў (хаця-ж і сярод іх паношыцца эндэцкая зараза). На зьедьдзе прадстаўнікоў павятовых соймікаў Віленшчыны і Навградчыны, які адбыўся ў Вільні 21 кастрычніка с. г., была прынята дужа цікаўная рэзалюцыя, якая ў першым пункце гаворыць, што „устаў аб камунальных фінансах павінен быць элястычны і прымаць пад увагу (—у першы чарод!) *тэрыторыяльныя асаблівасьці*, вынікаючыя з *адменных гаспадарчых варункаў*“. Як бачым, нават тыя, каму ўлада аддала ў рукі кіраўніцтва „маргарынавымі“ самаўрадамі Заходняе Беларусі, не маглі замаўчаць аб „адменных гаспадарчых варунках“ жыцьця нашага краю, якія павінны легчы ў аснову законаў, выдаваных для гэтага краю. Дык гэта-ж будзе ці ня больш красамоўны *пратэст проці польскага цэнтралізму*, чым усе заявы палітычных дзеячоў і партыяў!

Калі да ўсяго гэтага дадамо, што польская палітыка на нашых „Крэсах“ аканчальна збанкрутавала, бо, заліўшы край паліцыяй, агентамі дэфэнзывы і вайсковымі асаднікамі, давяла яго толькі да поўнае *анархіі*, — дык прыдзецца зрабіць вывад, што пара ўжо і беларусам і ўсім тым „краёўцам“, якія зацікаўлены аздараўленьнем і ўнармаваньнем жыцьця Заходняе Беларусі, перайсьці да актыўнае палітыкі ў кірунку здабыцьця *самастойнасьці* для нашага краю ў тэй ці іншай форме. І польскіх аўтанамістаў, і фэдэралістаў, і беларускіх незалежнікаў—усіх іх у гэты мамэнт злучае сьвядомасьць, што далейшая *палітыка „уніфікацыі“* (зьліцьця ў вадно цэлае) з Польшчай *забівае наш край і пагражае прост катастрофай*, запаведзяй чаго зьяўляюцца выпадкі апошніх месяцаў. А вынікам гэтае сьвядомасьці ў першую чаргу павінен быць *агульны пратэст проці сучаснага праўна-палітычнага палажэньня Заходняе Беларусі.*

Ведама, ў далейшым кожны палітычны кірунак, кожная палітычная партыя будзе весьці самастойна барацьбу за зьдзейсьненьне свайго палітычнага ідэалу ў адносінах да нашага краю—пачынаючы *ад аўтаноміі* і канчаючы *дзяржаўнай незалежнасьцяй.* Але першым і неабходным варункам для працы ў тым ці другім кірунку зьяўляецца здабыцьцё магчымасьці *свабоднае арганізацыі нашых народных сіл*, якія бы і ўзялі ў свае рукі кіраўніцтва ўсей гаспадаркай краю, ўсім яго жыцьцём.

Пастанова Бел. Пас. Клюбу 23. X. 24 г.

Разгледзіўшы агульнае палітычнае палажэньне ў сучасны момант і прыймаючы пад увагу, што

самыя неабходныя культурныя і матарыяльныя інтарэсы беларускага насяленьня няўпынна дратуюцца і не прызнаюцца ўрадам;

поўнае бяспраўе і нячуваныя зьдзекі адміністрацыі над безбаронным народам давялі працоўныя масы да цэлага раду аружных выбухаў, актаў стыхійнае помсты і самаабароны;

ня гледзючы нават на самые куртатыя законы аб мовах, якія разьлічаны былі на заграніцу, зачыняюцца апошнія беларускія школы, і беларускія дзеці штрафамі заганяюцца ў польскую школу;

ня відаць ніякіх знакоў зьмены датыхчасовай палітыкі на беларускіх землях,—

Беларускі Пасольскі Клюб пастанаўляе прадаўжаць далей вострую опозіцыю да сучаснага ўраду, выяўляючы перад усім сьветам і народам запраўднае палажэньне беларускіх зямель над Польскім панаваньнем.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаушы, давай суседу, ці знаемаму, каб і ён пазнау прауду аб жыцьці свайго народу і даведауся, што робіцца на сьвеце!

Аб чым пішуць.

Водгукі прэсы на экспозе п. Грабскага.

Напярэдадні адкрыцьця Сойму і выступленьня п. Грабскага орган п. Вітаса „Piast“ наперад высказаўся аб палітыцы сучаснага польскага ўраду:

> Перад разьездам Сойм даў ураду ня толькі шырокія паўнамоцтвы, але і блізу поўную свабоду дзейнасьці. Такіх лёгкіх варункаў працы ня меў яшчэ дагэтуль ніводзін урад у Польшчы. Аднак, **урад ашукаў ускладаныя на яго спадзяваньні** і даказаў, што **даваньне яму гэных паўнамоцтваў** Соймам было **абмылкай**, якая можа памсьціцца і на Сойме, і—што йшчэ горш—на дзяржаве.
>
> Ня хочам быць галаслоўнымі. У замежнай палітыцы перад намі стаяць **грозныя небясьпекі**, ня гледзячы на тое, што „лейборганы“ п. Скшыньскага, міністра заграгічных спраў, апавядаюць цуды аб яго жэнеўскіх удачах....
>
> ... Скандал з нападам пад Лунінцом выявіў нябывалае прост **расстройства адміністрацыі, трусасьць урадоўцаў і нястачу ў іх нават людзкае годнасьці**...
>
> .... Адстаўка ваяводы Довнаровіча ня ёсьць здаваленьне абражанага маестату гаспадарства і чэсьці народу, тут павінен быць і ёсьць адказным увесь урад, як вінавайца гэнае катастрофы, калі ў яго ёсьць хоць трохі пачуцьця сваіх абавязкаў. Калі ён гэтага не разумее, дык Сойм павінен яму гэта напомніць....

Ня дзіва, што, пасьля такога „прывітаньня“ з боку „пястоўцаў“, нельга было спадзявацца прыхільных адносінаў да ўраду пасьля экспозэ п. Грабскага, аб якім ніхто нічога добрага ня мог сказаць. Найбольш востра выступіў проці п. Грабскага і яго палітыкі пэпэесаўскі „Robotnik“:

> П. Грабскі прамаўляў доўга, тры гадзіны. Але зусім ашукаў спадзяваньні. У яго прамове ня было нават сьледу ўрадавае праграмы. Ня было глыбейшае палітычнае мысьлі. Ён не абняў суцэльнасьці нашага жыцьця. Ня было і пляну працы ўраду на будучыну. Гэта была „фаховая“ прамова міністра скарбу, занепакоенага станам краёвае гаспадаркі, кідаючага цыфры поўнымі жменямі, стрымліваючага пэсымізм, запавядаючага, што ўсё ж такі будзе лепей, маралізуючага „пагаспадарску“. Але гэта ня была прамова прэм'ера, гэта ня было вызначэньне дарогі і кірунку.
>
> ... П. Грабскі ня даў праграмы. Не закрануў нават спраў вялікае вагі, якія стаяць на парадку дня.
>
> .... П. Грабскі прамаўляў, як занепакоены гаспадар, якому маркотна, з прычыны неўраджаю. Але апавяданьне аб клапотах і пацяшаньне, што будзе лепей, ня можа быць прызнана за экспозэ прэм'ера.

На адсутнасьць праграмы — асабліва ў справе „Крэсаў“—жаліцца і орган процілежнае партыі, эндэцкая „Gaz. Warsz.“:

> Гаварыў п. Грабскі такжа і аб праблеме нашых усходніх ваяводзтваў. Паміма ўсяго, што ўрад зрабіў у гэтай справе, стан гэтае праблемы—нездавальняючы. Урадавай палітыцы ўсьцяж не хватае ясна вызначанага пляну, а пры выпаўненьні зробленых ужо пастановаў не хватае энэргіі і пасьледавальнасьці.

Што праўда, то праўда: найлепшы прыклад—языковыя законы і.... іх **не** выпаўняньне!

Адзіным апраўданьнем для п. Грабскага і **палітыкі** ягонага ўраду зьўляецца, як-быццам, тое, што ён не палітык, а — **эканаміст.** Аб гэтым кажа „Kur. Warsz.“:

П. Грабскі зьяўляецца перадусім эканамістам. Дзеля гэтага ягонае экспозэ мае ў сабе пераважна зьмест эканамічны.

... Лічым адпаведным, слушным, карысным, што на чале ўраду стаіць эканаміст у шырокім разуменьні гэтага слова.

Сяньня ў Польшчы стаім перад **эканамічнымі клапотамі.**

На гэтыя „эканамічныя клапоты" звараčаюць увагу, здаецца, ўсе польскія газэты бяз розьніцы кірунку. „Dzien. Polski" піша:

У кулюарах пераважаў пагляд, што прамова прэм'ера была ведзена ў **пэсымістычным** тоне і гэтым прынцыпова розьнілася ад папярэдніх прамоваў...

А „Słowo Polskie" закідае п. Грабскаму, што ў экспозэ яго

няма пазытыўнага і творчага становішча ўраду ў адносінах да **цяжкога гаспадарчага крызісу**, які перажывае дзяржава.

І далей газэта шчыра маркоціцца з прычыны таго, што

разьвіцьцё **Рэчыпаспалітай**, як дзяржавы, якая хоча ня толькі ператрываць сярод узьнімаючыхся небясьпек і міжнародавых канфліктаў, але й разрасьціся ў магутнае гаспадарства, прыймаючы ўчасьце ў тварэньні новага парадку, ў укладзе палітычных сілаў пасьля вэрсальскага трактату,—**стаіць сяньня на мёртвым пункце.**

Сумныя вызады робяць **польскія** партыйныя органы з экспозэ п. Грабскага, — аднак, здаецца, Сойм усё ж такі яму выскажа сваё даверые!... Больш пасьледавальнымі зьяўляюцца ўжо клюбы „меншасьцяў": яны ўсё роўна не дабіваюцца для сябе месца ў урадзе сучаснае Польшчы, дык могуць ясна і выразна ня толькі ў прэсе, але і ў галасаваньні ў Сойме высказаць, што думаюць аб урадзе п. Грабскага.

А—віч.

Інтэрпэляцыі Беларускага Пасольскага Клюбу.

№ 108—да п. міністра справядлівасьці ў справе **арыштаваных**—І. Руббы, Т. Талочкі і Ст. Шэнды:

У месяцы сакавіку 1923 г. паліцыяй былі заарыштаваны: Юльян Рубба, Тодар Талочка і Сьцяпан Шэнда, жыхары вёскі Цілевічы, Чэрэскае гміны, Дзісьненскага пав., і пасаджаны ў вастрог ў Вільні на Лукішках. Ня гледзячы на тое, што ад часу пазбауленьня іх волі мінула колькінаццаць месяцаў, справа заарыштаваных дагэтуль ня была разгледжана судом.

Дзеля гэтага ніжэйпадпісаныя пытаюцца ў п. міністра: ці маніцца прысьпяшыць сьледзтва ў справе сказаных заарыштаваных?

Варшава, 22 кастрычніка 1924 г.

№ 109—да п. міністра справядлівасьці ў справе **арышту б. вучня** Язэпа Гароха, жыхара вёскі Новая Весь, Гарадзейскае гм., Нясьвіжскага пав. —

У часе каля 1 га ліпня с. г., па загаду пракурорскае ўлады, нясьвіжская паліцыя заарыштавала б. вучня духоўнае сэмінарыі ў Крамяніцы, Язэпа Гароха, жыхара в. Новая Весь, Гарадзейскае гм., Нясьвіжскага пав. У часе ад новага году 1924 г. аж да заарыштаваньня Я. Гарох жыў пры бацькох у вёсцы, бо бацьком не хапіла грошы вучыць сына. Язэп Гарох дагэтуль сядзіць у вастрозе ў Луцку, пад залог яго не выпускаюць, і, ня гледзячы на тое, што пачатнае сьледзтва даўно закончана, акту абвінавачаньня ён яшчэ не дастаў.

Язэп Гарох, як сьведчаць людзі з яго вёскі, чалавек спакойны, ды вядзе сябе, як сьлед, ніякай палітыкай не займаўся і нават ня быў у Крамяніцы некалькі месяцаў. Арышт Я. Гароха, відаць, знаходзіцца ў сувязі з масавымі арыштамі вучняў духоўнае сэмінарыі ў Крамяніцы.

Дзеля вышэйсказанага інтэрпэлянты пытаюцца ў п. міністра: 1) ці яму ведама аб гэтым? 2) ці маніцца прысьпяшыць прадстаўленьне арыштаванаму акту абвінавачаньня, або звольніць яго пад залог?

Варшава, 22 кастрычніка 1924 г.

№ 110—да п. міністра ўнутраных спраў у справе **заняцьця паліцыяй дому** Паўла Шышлы ў вёсцы Калодкі, Даўгінаўскае гм., Вялейскага пав.—

У вёсцы Калодкі, Даўгінаўскае гм., Вялейскага пав., паліцыя заняла дом Паўла Шышлы і, хаця жыве ў ім ужо другі год, гаспадару блізу нічога ня плаце. П. Шышла мае вялікую сям'ю і, ня маючы магчымасьці гэтак шмат сьведчыць дзяржаве, неаднакроць звараčаўся да староства, каб звольнілі яго дом, але просьбы яго ня былі здаволены.

Дзеля вышэйшага інтэрпэлянты пытаюцца ў п. міністра: ці маніцца загадаць, каб паліцыя звольніла дом П. Шышлы, ці каб плаціла яму адпавядаючую справядліва плату?

Варшава, 22 кастрычніка 1924 г.

№ 111 — да п. міністра ўнутраных спраў у справе **катаваньня паліцыяй** жыхараў м. Вішнева, Валожынскага пав.:

У сувязі з нападам на м. Вішнева, Валожынскага пав., тутэйшая паліцыя распачала **зьдзекі** над тутэйшай люднасьцяй, ня меўшай нічога супольнага з нападам. Ход гэтых надужыцьцяў пацярпеўшыя апісваюць гэтак:

„У начы з пятніцы на суботу, 18—19 ліпня с. г., да Вішнева прыехалі бандыты, якія зразу напалі на пастарунак паліцыі, каб злавіць вядомага **ката**—заступніка каманданта, каторы, аднак, здалеў схавацца ў бульбе. Пасьля заст. каманданта прабаваў знайсьці прыпынак у найбліжэйшым доме Язэпа Стасяловіча, але гаспадыня, не пазнаўшы паліцыянта (ён быў толькі ў бялізьне), ня пусьціла яго ў хату. Бандыты ўзялі каня ў ксяндза, абрабавалі пошту, некалькі багацейшых крамаў, ды ўцяклі з места яшчэ да дня ў суботу. Тымчасам толькі ў нядзелю ўвечары 20 ліпня с г. ўсе паліцыянты пачалі хадзіць па хатах жыхароў м. Вішнева і да немагчымасьці **зьдзекавацца і катаваць зусім бязьвінных жанчын.** Гэтак былі скатаваны: жонка Язэпа Стасяловіча і кватарантка Марыя Гардзевіч — за тое, што ня пусьцілі ў хату ўначы заступніка каманданта, які ўцякаў ад бандытаў; Станіслава Юш была страшэнна біта пры „баданьні" ды ў яе пыталіся, ці належаў да банды яе нарачоны, які, як ведама з пісем, знаходзіцца ў Расеі. У той-жа вечар паліцыя ўвайшла ў хату Вольгі Рублеўскай, старэйшае жанчыны, абступіла яе з вінтоўкамі, загадала станавіцца на калені і казаць, як перад сьмерцяй, ці прыяжджаў з Расеі яе сын, які ад 1914 году знаходзіцца ў Расеі, дзе і ажаніўся, ды зусім да маткі не давядываецца. Калі нешчасьлівая кабета клялася, што ня бачыла сына некалькі гадоў, заступнік каманданта пачаў яе біць па бакох, плячох, галаве 1 г. д. Кабета была зьбіта да таго, што ажно кроў з горла пайшла, а пасьля нешчасьлівая пачала кашляць крывёй".

Дзеля вышэйшага ніжэйпадпісаныя пытаюцца ў п. міністра: 1) ці ведама яму аб вышэйшых надужыцьцях дзяржаўнае паліцыі? 2) ці маніцца аддаць судовай уладзе заступніка каманданта паліцыі м. Вішнева за катаваньне людзей?

Варшава, 22 кастрычніка 1924 г.

№ 112 — да п. міністра ўнутраных спраў у справе **надужыцьцяў войта і паліцыі ў м.** Даўгінаве, Вялейскага пав.—

25 жніўня с. г. ўрад Даўгінаўскае гміны Вялейскага пав., загадаў сялянам вёсак Зэзнава і Грышкевіч паехаць правіць дарогу каля маёнтку Каролін-Зэзнова. 10 верасьня с. г. раненька прыехалі сяляне на месца працы, гдзе праждалі войта да 3 гадз. і разьехаліся да хат. 12 верасьня паўтарылася тое самае. Абураныя гэткімі адносінамі да іх войта, сяляне назвалі гэта **прыгонам.** Вынікам гэтага было тое, што даўгінаўская паліцыя заарыштавала і трымала некалькі дзён на пастарунку гэткіх жыхараў вёскі Зэзнава: Язэпа Ляшковіча, Караля Ляшковіча, Мікалая Бабарыку, Тамаша Юркевіча і Язэпа Бабарыку. Камандант пастарунку пры дапросе арыштаваных крэпка пабіў Язэпа Ляшковіча.

Дзеля вышэйшага інтэрпэлянты пытаюцца ў п. міністра: ці маніцца правясьці сьледзтва ў гэтай справе і пакараць вінаватых у надужыцьцях?

Варшава, 22 кастрычніка 1924 г.

№ 113 — да п. міністра справядлівасьці ў справе **арыштаваных** Язэпа Шпакоўскага і Віктара Цьвіркі.

У сувязі з рабункамі, учыненымі жаўнерамі 27 палка ўланаў у Стаўпецкім павеце, былі заарыштаваны Язэп Шпакоўскі і Віктар Цьвірка, жыхары вёскі Кучкуны, Стаўпецкае гміны. Заарыштаваных пасадзілі ў склепе ў м. Стоўпцах, дзе ім зусім не давалі есьці і не зьмянялі бялізны. У працягу 8 тыдняў родныя павінны былі рупіцца аб іх долі і дастаўляць ім ежу і бялізну, бо, інакш ім магла пагражаць сьмерць ад голаду, і хваробаў. Цераз 8 тыдняў арыштаваных перавезьлі ў вастрог у Наваградку.

Сьледчаму судзьдзі ў м. Стоўпцах родныя арыштаваных падалі паручыцельства, падпісанае правамоцнымі жыхарамі вёсак Кучкуны, Ябланоўка і Адцэдкі, просячы звольніць арыштаваных. Аднак, сьледчы судзьдзя ня звольніў арыштаваных, а пераслаў у Наваградак.

Дзеля вышэйшага інтэрпэлянты пытаюцца ў п. міністра: 1) ці маніцца прысьпяшыць разгляд справы заарыштаваных? 2) ці маніцца зрабіць сьледзтва ў справе недаваньня арыштаваным ежы і бялізны ды пакараць вінаватых?

Варшава, 22 кастрычніка 1924 г.

№ 114—да п. міністра рэлігійных вызнаньняў і народнае асьветы ў справе **зачыненьня праваслаўнае парафіі** ў Дубінах, Лосінскае гміны, пав. Бельск- Падляскі:

У сувязі з праектаванай міністэрствам рэдукцыяй праваслаўнае парафіі ў Дубінах, пав. Бельск-Падляскі, была пададзена ў міністэрста рэл. вызн. і народ. асьветы, просьба, каб парафія была пакінена. Прасіцелі сваю просьбу апіраюць на тым, што 1) парафія ў Дубінах налічае каля 4.000 душ, а іменна: в. Арэшкава 817 душ, в. Вярхоўскае - 51, м. Гайнаўка — 350 душ, в. Юдзянка—53, в. Савін Грод—72, в. Пастолава—63, в. Скрыплева—42, в. Ліпіны—137, в. Лосінка — 167, в. Навасады—507, в. Смаляны Садок—34, в. Пераходы—28, в. Звадцэдзка — 33, в. Сарочая Ножка — 27, в. Дубінская Фэрма—42, в. Котаўка—170, в. Дубіны—560 душ праваслаўных (—гэтыя цыфры ўрадова пасьведчаны адпаведнымі солтысамі); 2) што парафія заўсёды была штатнай і самастойнай; 3) што парафія знаходзіцца пасярод найвялікшых вёсак, што дае магчымасьць лёгкіх зносінаў; 4) што царква тут мураваная, пабудаваная коштам парафіян бяз ніякага ўчасьця дзяржаўнага скарбу і ніколі ня была ані каталіцкім касьцёлам, ані ўніяцкай царквой, і 5, што ў межах гэтае парафіі ёсьць 600 душ каталікоў, якія маюць касьцёл у Гайнаўцы.

Дзеля вышэйшага і пазываючыся на арт. 115 канстыцуцыі, у якім гаворыцца: „Цэрквы рэлігійных меншасьцяў і іншыя законна прызнаныя рэлігійныя саюзы ўпраўляюцца сваімі статутамі, прызнаць якія дзяржава не адмовіцца, паскольку ў іх няма пастановаў, супярэчных з законамі. Адносіны дзяржавы да гэтых цэркваў і вызнаньняў будуць устаноўлены **законадаўчай** дарогай па паразуменьні з іх законнымі прадстаўніцтвамі",—ніжэйпадпісаныя пытаюцца ў п. міністра: 1) ці маніцца зрачыся рэдукцыі праваслаўных парафіяў, як супярэчнай з польскімі законамі? 2) ці маніцца пакінуць праваслаўную парафію ў Дубінах?

Варшава, 22 кастрычніка 1294 г.

№ 115—да п. міністра земляробства і дзяржаўнае маемасьці ў справе **сялянскае зямлі,** узятае пад дзяржаўныя тартакі ў Гайнаўцы, Горадзенскага пав.:

У 1915 годзе нямецкая ўлада на сялянскай зямлі ў Гайнаўцы пабудавала тартак. Тартак разам з усімі жылымі будоўлямі займае 54 дзесяціны зямлі. Цяпер тартак гэты знаходзіцца ў валаданьні дзяржавы. Зацікаўленае насяленьне — ўласьнікі сваей зямлі ўжо некалькі гадоў дамагаюцца ад ураду звароту іх зямлі, або надзяленьня іх у такім жа разьмеры зямлёй у іншым месцы, да прыкладу зямлёй, якая знаходзіцца паміж іхнімі грунтамі,—ды заплаты арэнды за карыстаньне 54 дзес. зямлі. Справа гэтая дагэтуль урадам памысна ня ўладжана, хаця ўласьнікі зямлі прымушаны плаціць падаткі і публічныя даніны.

З прычыны таго, што сяляне вёскі Гайнаўкі маюць мала ўласнае зямлі, і з увагі на зямельную рэформу ніжэйпадпісаныя пытаюцца ў п. міністра: 1) ці маніцца—паразумеўшыся з п. міністрам зямельных рэформ, вызначыць уласьнікам зямлі, занятае пад тартак, адпаведную сколькасьць дзяржаўнае зямлі? 2) ці маніцца заплаціць арэнду за карыстаньне з сялянскае зямлі?

Варшава, 22 кастырычніка 1924 г.

№ 116—да п. міністра зямельных рэформ у справе абыходу сялян м. Бытэня, Слонімскага пав., пры парцэляцыі маёнтку Плянты:

Паміж сялянскімі дзялянкамі м. Бытэня, Слонімскага пав., ёсьць 11 кускоў зямлі, якія належаць да маёнтку Плянты. Зямля гэная, абыймаючы болей меней 6—8 дзесяцін, была арэндавана беззямельнымі і малазямельнымі сялянамі, як-то: З. Грынчук, П. Гэрбэлік, П. Нагула, М. Маслоўскі, Ст. Маслоўскі, М. Мялюшкевіч, М. Масальскі і інш. Цяпер зямля гэная перанята на ўласнасьць дзяржавы і празначана на парцэляцыю. Сяляне просяць вызначыць гэту зямлю мяйсцовай люднасьці. Аднак, акружны земскі камісар у Горадні зямлю гэную празначыў Адварду Пекарскаму, упраўляючаму м. Плянты, які паходзіць нават не з тутэйшае людна́сьці. Падобная парцэляцыя, праводжаная ўрадам, крыўдзіць мяйсцовую люднасьць на карысьць чужога каляніста.

Дзеля вышэйшага інтэрпэлянты пытаюцца ў п. міністра: 1) ці ведама яму аб гэтым? 2) ці маніцца вызначыць сказаныя 11 кускоў зямлі жыхарам м. Бытэня?

Варшава, 22 кастрычніка 1924 г.

№ 117 да п. старшыні рады міністраў у справе **ўвядзеньня вынятковага стану на Беларускіх землях:**

У сувязі с вадлівым станам публічнае бясьпечнасьці на Беларускіх землях і хваляй нападаў, якія здарыліся ў апошнія летнія месяцы, урад зрабіў рад пастановаў і загадаў, якія абмяжоўваюць грамадзкія правы „крэсавага" насяленьня, уводзячы гэтак **вынятковы стан.** Хаця арт. 123 і 124 канстытуцыі прадбачаць спыненьне грамадзкіх правоў дарогай увядзеньня вынятковага стану, аднак-жа шлях, які абабраў урад, нязгодны з канстытуцыяй. Загады гэныя, хаця афіцыяльна не названы вынятковымі, аднак на дзеле ўводзяць вынятковы стан. Да гэтых загадаў належаць: замена цывільных ваяводаў генерал-ваяводамі, якія ў патрэбе могуць карыстацца аружнай сілай і забарона паслам рабіць справаздаўчыя вечы. У мысьль гэтых загадаў груба было разагнана справаздаўчае веча ў Гарадку Беластоцкім 7 верасьня с. г., арганізаванае паслом Валошыным, а таксама ня было дапушчана справаздаўчае веча ў м. Крынках, Горадзенскага пав. Калі 8 верасьня пасол Валошын замалідаваў на пастарунку паліцыі ў м. Крынках, што маніцца сазваць справаздаўчае веча, — камандант пастарунку заявіў, што не пазволіць рабіць веча, бо Горадзенскі пав. належыць да так-званых „Усходніх Крэсаў", гдзе ўведзены вынятковы стан.

Вышэйшыя факты і заява каманданта паліцыі кажуць аб тым, што дарогай тайных цыркуляраў мяйсцовае насяленьне абмяжована ў сваіх грамадзкіх правох. Калі сабе ўсьвядомім, што, апрача гэтых надзвычайных паўнамоцтваў, дадзеных выканаўчай уладзе, на Беларускіх землях істнавала ўжо вялікая прорва між мясцовым грамадзянствам і дзяржаўнай адміністрацыяй, дык зразумеем, што адносіны гэтыя з кожным днём усё больш пагаршаюцца.

Дзеля вышэйшага падпісаныя пытаюцца ў пана старшыні рады міністраў: 1) на якой падставе выданы загады, якія забараняюць справаздаўчыя пасольсія вечы і становішчы ваяводаў абсаджаны генераламі? 2) ці ўрад і надалей маніцца супакоіваць Беларускія землі дарогай ужываньня вынятковага загаду?

Варшава, 22 кастрычніка 1924 г.

Палітычны агляд.

У Польшчы.

Вастрожная камісія Сойму.

Камісія, выбраная Соймам дзеля агляду польскіх вастрогаў, у сераду 19.Х—ізноў пачне працу—па „ўзгадненьню пратаколу“...

Дык вось мы толькі цяпер даведаліся афіцыяльна, што разам з Соймам адпачывала на вакацыях і гэтая „вастрожная камісія“, зусім не сьпяшаючыся з сваім „пратаколам“...

А ў вастрогах, як сцьвярджае „Robotnik“, як білі, так і б'юць...

Пас. Тугутт і „Wyzwolenie“.

Як высьнілася, п. Тугутт ня вернецца да клюбу „Wyzwolenie“, ды з прычыны гэтага нават зрачэцца пасольскага мандату. За тое-ж напэўна дастане... міністэрскую пасаду!

Гішпанска-генаральскія „rządy“.

Варшаўскія газэты пішуць аб в. характэрным выпадку ў м. Быдгошчы — на „заходніх крэсах“ Польшчы.

Да рэдакцыі газэты „Dz. Bydgoski“ прыбыў генарал дывізіі разам з шэфам штабу, пакінуўшы на вуліцы пад вокнамі рэдакцыі атрад уланаў, і зажадаў, каб рэдактар і супрацоўнікі падпісалі абязацельства, што больш ня будуць нічога пісаць пра вайскавыя парадкі ў месьце.

Рэдактар пад націскам пагрозы гвалтам — падпісаў „дэклярацыю“.

Тады генарал праз вакно крыкнуў уланам, што яны—ўжо непатрэбны і могуць ехаць дамоў.

Цікава было-б, што было-б, калі-б уланы аказаліся „патрэбнымі“...

Цікава, што газэта—хадэцкая, а генарал мае нямецкае прозьвішча Thomme!

„Sprzedaż i kupno Rzeczypospolitej“.

Мы ўжо паведамлялі чытачоў, што пас. Корфанты купіў у п. Падэрэвскага газэту „Rzeczpospolita“—з усімі друкарскімі машынамі, магазынамі, аддзеламі, адміністрацыяй і... рэдакцыяй, з усімі супрацоўнікамі—з праф. Строньскім на чале.

Але рэдакцыйная калегія збунтавалася проці гэткай прадажы іх, як „жывога інвэнтару“, разам з газэтай і адмовілася працаваць з Корфантым.

Б. рэдактар Строньскі піша, — што п. Падэрэвскі (ўласьнік газэты, які фінансаваў яе ідэйна), абяцаў яму асабіста, што, калі будзе прадаваць газэту, дык пяршынства дасьць яму, Строньскаму, як прадстаўніку супрацоўнікаў. Але праз колькі дзён прадаў газэту Корфантаму.

У адказ на гэта п. Корфанты ў сваей ужо „Rzeczyp.“ піша, што як Строньскі, таксама і ўся рэдакцыя ня мела нічога проці таго, каб працаваць у яго, што п. Строньскі колькі разоў прасіў у яго, Корфантага, каб фінансаваў газэту...

Пасварыліся, як заўсёды, паны „патрыёты“ за грошы.

П. Падэрэўскі, які, апрача першых выдаткаў, усадзіў у „Rzeczp.“ 1 мільён 600.000 злот., не прадаў газэты п. Строньскаму і працаўнікам рэдакцыі, бо яны ня мелі гатоўкі, а апрача таго, лічылі частку паёў сваімі. А п. Корфанты заплаціў адразу 100.000 даляраў гатоўкай.

Калі-ж п. Строньскі і іншыя супрацоўнікі захацелі адкупіць газэту ад п. Корфантага, дык той зажадаў ад іх ужо 150.000 даляраў—і то зразу гатоўкай, хаця сам купіў яе ў п. Падэрэвскага за 100 тысяч даляраў. Інакш кажучы, п. Корфанты, як добры польскі купец, захацеў на гэтай „патрыятычнай транзакцыі“ зарабіць 50% за 2 дні,—ці 18.000 працантаў гадавых... Здаецца толькі, што сам гэты пасол у Сойме галасаваў за закон, які дазваляе браць толькі 12 ці 24%!...

У рэзультаце—група Строньскага будзе выдаваць новую газэту „Warszawianka“,—дык адным „хіенёнкам“—будзе больш!

Заграніцай.

Разрыў Францыі з Ватыканам.

Фінансавая камісія парляманту скасавала крэдыт на пасольства ў Рыме пры папскім двары (Ватыкане).

На тым самым паседжаньні прыняты крэдыт, у суме 100.000 франкаў, на адчыненьне пасольства ў Маскве.

Пераварот у кітайскай сталіцы.

У Пэкіне, з прычыны перамогі мангольскай арміі ген. Чонг-Со-Ліна, адбыўся дзяржаўны пераварот. Самі генаралы ўрадовай арміі скінулі глаўнакамандуючага Ву-Пэй Фу, спынілі ваенныя чыннасьці і згадзіліся пусьціць у Пэкін войска ген. Сэн-Юн Кінча.

Пасьля гэтага дывізія Сэн-Юн Кіянга заняла ўсе дзяржаўныя ўстановы, арыштавала міністраў і акружыла палац прэзыдэнта, які загадзя ўцёк. Правадыры перавароту, да якіх належаў і міністар асьветы, выдалі адозву, у якой абвяшчаюць, што яны хочуць спыніць брата-бойчую хатнюю вайну, а дзеля гэтага—склікаць агульна-кітайскую канфэрэнцыю з учасьцем усіх правадыроў народу—ад Чанг-Со-Ліна („белы“) да Сун-Ят-Сэна („чырвоны“), каб зьдзейсьніць вялікае дзела аб'яднаньня Кітаю. Адозва выдана ад імя партыі — „Маладога Кітаю“.

Пішуць, быццам бязспрэчна наймацнейшы цяпер мілітарна генарал у Кітаю — манчжурскі губэрнатар Чанг-Со-Лін, пераможца Пэкінскага ўраду,—прыхіляецца да гэтай думкі „млада-кітайскай“ партыі.

Канец хатняй вайны ў Кітаю.

Афіцыяльная адозва пераможцы, манчжурскага „ваяводы“ Чан-Со-Ліна, абвяшчае канец хатняй вайны ў Кітаю.

Пасьля рашучага ўльтыматуму генарала Чан-Со-Ліна, прэзыдэнт рэспублікі і ўвесь былы ўрад падаліся ў адстаўку.

Апошнім загадам прэзыдэнта было спыненьне ваеннай акцыі.

У справе гвалтаў над палякамі ў Маскве.

Урад ССРР праз свайго прадстаўніка выразіў прадстаўніку Польшчы ў Маскве, п. Вышыньскаму свой жаль з прычыны здарэньняў з урадоўцамі польскага пасольства ў Маскве і Ленінградзе, абяцуючы, што вінавайцы будуць знойдзены і пакараны.

Радава-Латвійскі таргова дагавор.

У лістападзе ў Маскве пачнуцца перагаворы аб таргован умове ССРР з Латвіяй.

Пасол караля Гэджасу ў Маскве.

У Маскву прыехаў пасол экс-караля Гэджасу, Гусэйна, са скаргаю на Англію, якак ня споўніла сваіх абавязкаў, выплываўшых з умовы 1915 г.

Гэтае пасольства да Радавага Ураду — вельмі цікава ў сувязі з тым пажарам, — які ўсё разгараецца на бліжэйшым Усходзе проці Англіі, і тым ваенным дагаворам, які істнуе паміж Турцыяй і ССРР...

Радавая пазыка ў Лёндане.

Сябра ўраду дзяржаўнага банку ССРР, вярнуўшыся з Лёндану, заявіў, што 5 вялікіх англійскіх банкаў далі радаваму банку каротка тэрміновую пазыў суме некалькіх дзесяткаў мільёнаў рублёў—на фінансаваньне вывазу і ўвозу тавараў з заграніцы.

Інструкцыя камінтэрну.

У Англіі вялікую сэнсацыю зрабіла апублікаваньне англійскай ноты радаваму ўраду з пратэстам проці высланай англійскім камуністам за подпісам Зіновьева інструкцыі „исполкома“ III інтэрнацыяналу, аб падгатоўцы аружнага паўстаньня работнікаў і жаўнераў проці пануючага ў Англіі ладу.

Ракоўскі, сэкрэтар камуністычнае партыі ў Англіі і вядомы камўніст Мак-Манус заявілі ў прэсе, што інструкцыя—сфальшаваная.

Канфлікт паміж Турцыяй і Англіяй.

Канфлікт паміж Турцыяй і Англіяй, ня гледзячы на назначаны ўжо „суд“ у Радзе Лігі Народаў—абастраецца, і можа ў кожны мамэнт узгарэцца вайна. Англійскі флёт канцэнтруецца каля вострава Мальты. — „каб абараняць інтарэсы і гонар Англіі“ (ці націскаць на Раду Лігі?). А Турцыя заявіла, што некарыснага для яе рашэньня „суду“ яна прызнаваць ня будзе...

Некаторыя газэты падчырківаюць сьмеласьць Турцыі, якая ўжо раз не пабаялася аружнага канфлікту з Англіяй,—іменна ў 1922 годзе, калі яна вяла вайну з Грэцыяй, за якой хавалася памагаўшая ей Англія. Тады в. значна і зусім адкрыта памагла Турцыі Радавая Расея, апрача Францыі (якая хавалася за Турцыю —таксама, як Англія за Грэцыю). І вось гэты самы падпісаны тады ваенны дагавор паміж Турцыяй і ССРР мае сілу і цяпер. І зусім ясна, якія выгады можа даць абодвум старонам гэты дагавор і Турэччыне паможа адбіцца ад англійскай лапы, якая захапіла яе правінцыю Мосуль, а ССРР паможа націснуць на кансэрватараў і лібэралаў у Англіі і каб не працівіліся абяцанай Мак-Дональдам пазыцыі.

Цікава, як гэта магутная Англія сама-ж заплаціць за тое, каб яе пабілі ў Малай Азіі?!...

Выбарныя кампаніі ў Англіі.

У сваей прамове ў Брыстолю Мак-Дональд казаў, што, калі работніцкая партыя не здабудзе ізноў улады, тады ўся праца на апошняй сэсіі Лігі Народаў змарнуецца.

Арышт Дэ-Валеры.

Улада Улястэру (паўночная невялічкая частка острава Ірляндыі, ня ўвайшоўшая ў Ірляндзкую самастойную дзяржаву і палітычна лічучая сябе часткай Англіі), арыштавала правадыра ірляндзкіх незалежнікаў-рэспубліканцаў Дэ-Валеру у мамэнт, калі ён прамаўляў на мітынгу. Пасьля яго зьвольнілі, выслаўшы ў Ірляндыю.

Яшчэ арышты камуністыч. пасалоў у Нямеччыне.

У Нямеччыне паліцыя арыштавала яшчэ 2 паслоў-камуністаў, ад мамэнту распушчэньня Сойму—страціўшых пасольскую нятыкальнасьць...

Імкненьне да манархіі ў Нямеччыны.

На канфэрэнцыі, скліканай галавой нацыяналістаў адміралам Тырпітцам, адзін з паслоў партыі заявіў, што новы парлямант і новы ўрад пачнуць адбудову манархіі, пачынаючы ад Бавары.

Нямецкі крон-прынц кандыдатам у Сойм.

Амэрыканскія газэты падаюць, што на выбарах у парламант мае выставіць кандыдатуру сын Вільгельма II—„Насьледнік трону Гогэнцолернаў“.

Латвійска-літоўскія адносіны.

У зьвязку з тымі палёнафільскімі тэндэнцыямі, якія ахапілі частку латвійскіх грамадзка-палітычных колаў, і ў зьвязку з пазіцыяй, якую занялі ў Лізе Народаў латвійскія дэлегаты ў Віленскім пытаньні, ў Літве раздаюцца ўсё больш галасы аб больш шырокім літоўска латвійскім зьбліжэньні. У латышскай газэце „Jaunakas Zinas“ № 240 надрукаваны зьмест цікавай перадавіцы з газэты „Lietuva“, якой у Літве прыдаюць вялікае значэньне. Стацьця мае назоў: **„Віленскае пытаньне і Балтыцкія дзяржавы“.**

„Балтыцкія дзяржавы, абгаварываючы ў Лізе Народаў Віленскае пытаньне, йшлі разам з палякамі, выступаючы проці літвіноў, хоць яны добра ведалі, што палякі атрымалі Вільню, зламаўшы Сувалкскі дагавор, і што там палякі правялі незаконны плебісцыт. Але Польшча — вялікая дзяржава, ей пратажыруе Францыя, і, ўрэшце, „рэальная палітыка“ Балтыцкіх дзяржаў вымагае йсьці разам з палякамі, а з маленкаю Літвою, якая ў выпадку вайны з Радавай Расеяй, ня зможа быць досыць моцным саюзьнікам. Але палітыкі Балтыцкіх дзяржаў забываюць, што, зьвязываючыся з Польшчаю, яны робяць сваё істнаваньне залежнымі ад польска-расейскіх адносінаў. Калі-б пачалася вайна палякоў з Расеяй, то апошняя, каб забясьпечыць сабе правае крыло, прымушана будзе заняць Балтыцкія дзяржавы. Польшча знаходзіцца досыць далёка, каб магчы прыйсьці з дапамогай. Апрача таго, расейцы ў першую чаргу займуць так-званы „польскі калідор“, і зусім адрэжуць гэтыя дзяржавы ад Польшчы, катораяня зможа паслаць ім дапамогу і морам, бо ў яе няма патрэбнага для гэтага флёту. Калі цяпер латышы ня могуць зразумець літоўскага „ўпорства“, тады няхай яны падумаюць, што-б яны сказалі калі-б Бэрмонт заняў Рыгу і Літва падтрымала гэты крок? Ці-ж ня тое самае, што цяпер павінны сказаць літвіны, бачучы, як латышы расчыняюць абоймы ў бок польскі? Ці-ж латышы зусім спакойныя, што ня зьявіцца які-небудзь новы Жэлігоўскі для тых 7 валасьцей, на каторыя палякі і цяпер прэтэндуюць?“

Але, ня гледзячы на такія мяркаваньні, запраўды „рэальная палітыка“ (аўтар гэтае перадавіцы — Пурыцкіс), трудна чакаць у бліжэйшай будучыні якога-небудзь рэальнага водгуку з боку латышоў.

Сучасны коаліцыйны габінэт апіраецца на вельмі нязначную большасьць у Сойме, а таму кожны яго праект ня толькі выклікае зараз-жа вялікі пратэст з боку апазіцыі, але й які-небудзь контр-праект, ці контр-крок. Апошнія часы коаліцыя высунула праект зьмены „закону аб грамадзянстве“. Зьмена зусім невялічкая, каля якой у іншы час бязумоўна ня было-б ніякіх спрэчак, бо справа йдзе аб зьмене 20-ці гадоў пабыту на тэрыторыі сучаснай Латвіі — на 15, г. ё. аб памяншэньні тэрміну ўсяго на 5 гадоў. Але таму, што ініцыятыва гэтага праекту выходзіць ад коаліцыйных фракцыяў, таму апазіцыя зараз-жа надала яму ярлык „жыдоўскага праекту“. Але гэтага здалося мала, трэба было высунуць яшчэ нешта. І вось, тыя самыя „меншасьцяеды“, якія на сваім сьцягу напісалі: „Латвія для латышоў“, ухапіліся за падтрымку польскага дэпутата Вержбіцкага ў яго інтэрпэляцыі аб дзеяльнасьці Ілукштанскага павятовага начальніка гр. Праўліня, які, быццам, усіх палякоў у сваім павеце залічае беларусамі. Сваю інтэрпэляцыю п. Вержбіцкі пакуль схаваў у кішаню, бо знайшоўся кампраміс — стварэньне камісіі для рассьледаваньня дзеяльнасьці гр. Праўліня; але ці захавае ён свае пагляды на другога Жэлігоўскага — ня ведама. Ня ведама таксама, якія новыя пляны куюцца ў кузьнях двух лагераў — коаліцыі і апазіцыі. У кожным разе латышскім палітыкам цяпер зусім не да Літвы: трэба раней знайсьці цьвёрдую раўнавагу ў сваей унутраняй палітыцы.

Лад

Рэзультаты выбараў у Нарвэжскі Сойм.

Абвешчаны рэзультаты выбараў у Нарвэжскі парлямант (Стартынг) — кансэрватары атрымалі — 54 мейсцы, радыкалы—34, партыя працы—24, земляўласьнікі—22, сацыялісты—8, камўністы—6, дэмакраты—2.

Палітычнае палажэньне ў Югаславіі.

Як мы пісалі, міравая палітыка дэмаратычнага ўраду Давідовіча ўжо, быццам зусім, давяла харвацкіх незалежнікаў да прымірэньня з сэрбскім народам і прызнаньню супольнай Югаслаўскай дзяржаўнасьці...

Яшчэ некалькі крокаў разумнай палітыкі (да таго-ж зусім выразна прадбачаных у Канстытуцыі),—і згода брацкіх народаў сталася-б фактам замацованым...

Але гэта, відаць, не наруку было сэрбскім „радыкалам“-цанталістам, захапіўшым, дзякуючы французскай помачы, гэгемонію, і вось уся справа мірнага паразуменьня была зусім зумысна сарвана каралём... Гэты правакацыйны крок караля ўжо даў рэзультаты: харвацкія паслы, сабраўшыся ў Загрэбе, прынялі в. вострую рэзалюцыю проці караля.

І вось, далей усё пойдзе, як і трэба, паводле праграмы „рэжысэраў“: край будзе абвешчаны ў нябясьпецы, парлямант распушчаны, кароль даручыў „радыкалам“—ген. Пашычу стварыць урад і правясьці выбары ў новы Сойм...

Што значыць „правясьці выбары“ на Балканах,—ведама надта добра.

Аб гэтым ужо выразна пішуць газэты, дадаючы, што радыкалы рашуча адкінулі ўсе прапазіцыі Давідовіча—аб адданьні ім 4 мейсц у габінэце, паставіўшы галоўным трэбаваньнем—аддаць ім і прэм'ерства.—Гэта значыць—скінуць Давідовіча і пасадзіць Пашыча.

Ніводзін прэм'ер, паважаючы сябе, ня мог-бы вясьці далей перагавораў...—Перарваў іх і Давідовіч... Цяпер „працуе“ „карона“...

Змова на Кемаля-пашу.

Турэцкія газэты падаюць, што выкрыта змова на жыцьцё дыктатара Турцыі, Кемаля-пашы. Замах меліся зрабіць 6 армянаў, якія прыбылі дзеля гэтага з Афінаў (Грэцыя). Паліцыя пярэчыць гэтым весткам.

ХРОНІКА.

„Бунт“ ксяндзоў. У Чэнстахове нядаўна адбыўся зьезд каталіцкіх біскупаў Польшчы, на якім было пастаноўлена выдзяліць з Віленскае дыэцэзіі два **беларускія** дэканаты: Берасьцейскі і Бельскі — і далучыць іх да **чыста польскіх дыэцэзіяў.**

Проці гэтае пастановы, як піша „Słowo“, узбурылася віленскае духавенства: ня гледзячы на „высока патрыятычнае“ жаданьне біскупаў аслабіць беларускі элемэнт у Віленскай дыэцэзіі (і так ужо далучанай—паводле праекту ўраду аб конкордаце з Рымам—да Варшаўскае мітраполіі), віленскія ксяндзы ў лічбе 400 душ убачылі ў гэтым пакушэньне на цэласьць Віленскае дыэцэзіі, роўнае колішнім пакушэньням на яе расейскага царскага ўраду, і паслалі свой пратэст у Рым да самога папы.

„Białoruskie biuro prasowe“. Усх. Агенства апавяшчае, што ў Гданску заснавалася Беларускае Прэс-Бюро, якое складаецца з падазроных з пагляду паліцыі (гданскай?) асобаў і выпускае інфармацыі, інспіраваныя, быццам, расейскімі камуністам (?).

„У кірунку Вільні“. Паведамленьні аб аружных нападах і рабунках дагэтуль канчаліся заявамі, што нападаўшыя ўцяклі „ў кірунку радавае граніцы“. Цяпер у паліцэйскіх камунікатах зьяўляецца навіна: бандыты, абрабаваўшы 24 кастрычніка аднаго з жыхароў в. Новасады, Рудзішскае гміны, уцяклі „ў кірунку Вільні“.

Да гэтага гожа дадаць, што пад Вільняй, як неаднакроць пісала „Słowo“, па публічных дарогах свабодна „працуюць“ аружныя вінтоўкамі бандыты, а ў самай Вільні чуць ня што-дня адбываюцца напады на акраінах.

Што ж робяць „пешыя і конныя паліцэйскія сілы“, якія так урачыста спацыруюць па вуліцах м. Вільні?!..

Карэспандэнцыі.

Палажэньне беларускае школы ў Косаўскім павеце.

У гэтай маленькай заметцы мне хацелася-б выясьніць тыя крокі, якія зрабіў наш народ да адкрыцьця роднае - беларускае школы ў Косаўскім пав., і тыя перашкоды, якія зьяўляюцца на кожным кроку да гэтага імкненьня к беларускай школе.

Калі Цэнтральная Беларуск. Школьная Рада кінула кліч „сяляне за родную школу“, узаконеную Соймам, дык амаль што не адначасна сяляне вёсак Яглевічы, Падстарыне, і Карошча падалі падантні да школьнага інспэктара. У гэтых вёсках жаднае школы няма, праўдзіва ня было, бо ніхто не хацеў трэбаваць „панскае“ школы, адмаўляючыся тым, што няма адпаведных будынкаў пад школу. Але-ж гэтыя будынкі адразу знайшліся, калі зьявілася магчымасьць адчыніць сваю родную беларускую школу, знайшліся і грошы (хоць пакуль у паданьнях да інспэктара) на школьных старажоў.

Сяляне вёсак Була і Грыўда даўно ўжо напісалі адпаведныя паданьні да школьнага інспэктара а „przekształcenie obecnie istniejącej polskiej szkoły“ ў беларускую школу, але гэтыя прыгаворы сялян ляжаць, пакуль што, без пасьледзтва.

Як я ўжо пісаў у аддзельнай заметцы, справу Буленскай школы тармозіць вучыцель істнуючае польскае школы (ён-жа намечаны сялянамі ў настаўнікі беларускае школы, бо іншага няма!). Ен баіцца ўгнявіць р. Inspektora беларускаю школаю, а сялян — польскай; як кажуць самы сяляне, „ён хоча зрабіць, каб былі ваўкі сытыя, ды козы цэлыя“. Але-ж з гэтага нічога ня выходзіць, бо дзеці ня ходзяць у польскую школу, а ён кажа, што „каровы пасуць“. А што п. Вірук будзе казаць, як сьнег нападаець, а дзеці ня пайдуць? Пэўне загаворыць языком штрафаваньня?!!

Што адносіцца да Грывецкай школы ды яе „przekształcenia“, дык тут справа стаіць трохі падругому. Перш за ўсё, няма каго паставіць настаўнікам беларускае школы „Jaśnie Wielmożny pan nauczyciel“ гэтае (польскае) школы заяўляець: „хутчэй я абрасту шэрсьцю, як гарылла, або шымпанз, чым буду вучыць пабеларуску“. Ды што гаварыць аб ім, калі пабеларуску ён ні бэ, ні цэ ня знаець?! Без указаньня настаўніка ў беларускую школу сяляне не падаюць прыгавора інспэктару.

Як даведаўся я, у цэлым радзе вёсак, як: Любішычы, Сенькавічы, Дубітава і др., справа арганізацыі беларускай школы стаіць на месцы проста праз драбніцу: няма каму напісаць паданьняў! Сяляне, шукаючы пісараў, ходзяць ад вёскі да вёскі. Праўда, ёсьць яшчэ адна перашкода — гэта, дзе ўзяць сваіх вучыцялёў?

З цэлага раду другіх вёсак даходзяць чуткі што, народ, ня гледзячы на розныя перашкоды ды труднасьці, зьвязаныя з арганізацыяю беларускае школы, аддаець усю сваю душу, каб толькі адчыніць сваю родную беларускую школу. Народ, як бачым, верыць у сваю школу, верыць таму, што ў гэтай школе можна чаму-кольвек навучыць дзяцей, а ня гэтак, як ў польскай школе, дзе дзеці забываюцца за месяц тое, што навучыліся праз цэлы год.

Так стаіць справа беларускай школы ў Косаўскім павеце.

М. Балінскі.

За ўсё плаці.

(*Вёска Чашчаўляны, Гожанскай гм., Гарадзен. п.*).

Няшчасная сялянская доля. Куды ні кінь, усюды—клін

Вось у жніўні месяцы, 1924 г. зьявіўся да нас някі пан і пачаў хадзіць па буракох у гародах. Ня толькі ў нашай вёсцы, але-ж па ўсей нашай гміне.

Усе зацікаўлены, чаго гэты пан шукае і штось усё піша, як агледзіць агарод. Дык вось даведаліся. Гэны пан прыехаў шукаць, дзе ёсьць тытун, і не разьбіраючыся, давай пісаць кожнага селяніна. Праўда, што ў некаторых быў тытун, але ж многія сяляне ўжо павырывалі і палажылі сушыць. Ды ў дадатак, ніхто ня ведаў, што тытуну нельга садзіць, ды Сойм яшчэ вясной ня прыняў закону аб забароне сеяць тытун.

Кожнаму ведама, што пры сёньняшніх цяжкіх варунках жыцьця няма за што купіць селяніну тытуну, бо амаль ня кожны дзень прыходзіцца плаціць падаткі. Калі селянін пасеяў тытун дзеля сваей патрэбы, дык за што ён павінен яшчэ плаціць, ды ў дадатак у той час, калі ня было забароны?

Дык што за бяда пану, калі і што пасеяў? Раз сёньня забаронена, дык павінен заплаціць за ўвесь час.

Кажуць, сыты галоднаму не зпагадае; дык запраўды гэта ёсьць так.

11 кастрычніка ўсе сяляне атрымалі ад ужэнду скарбовага карткі, каб заплаціць штраф за тое што быў пасеяны тытун. Усе мы сабраліся на сход і давай радзіцца, што і як рабіць.

Але-ж, браткі мае, усіх узяў страх, калі даведаліся, што трэ плаціць, як каму: па 20, 30 і 100 зл. штрафу за тытун!

Раіліся, раіліся і ніякой рады сабе ня далі. Ба, браткі мае, калі-б адмовіліся, дык прыйшла-б паліцыя і ўсё забрала б з хаты, а калі падаць заяву ў ужонд скарбовы, каб зьнялі гэны штраф, дык усё роўна трэба раней заплаціць, а калі ўжонд скарбовы здыме штраф, дык тагды грошы вернуць, але „пакуль сонца ўзойдзе, раса вочы выесьць.

Нашаму селяніну ніводзін пан не паможа, пакуль мы самі не з'рганізуемся...

Штраф заплацілі. N.

Куды ня кінь, усё — клін.

(*м. Далятычы, Наваградзкага пав.*).

На беразе Нёмна пабудована мястэчка Далятычы. Цячэ Нёман у нас ціха, гэтак і жыцьцё тут было ціхае, спакойнае. Есьць у нас і царква, але ма'быць ў кепскі час яна пабудавана, бо надта не шанцуе ёй, асабліва пасьля сусьветнай вайны. Быў спачатку—па вайне сьвяшчэньнік ацец Комар. Парафіяне вельмі хваляць яго, але спаткала яго бяда: перш укралі кабылку, а потым і цялё выцягнулі спад падрубу. Гэта здарылася, калі людзі ня мелі хлеба, а елі расьліну, дык можа каму і захацелася папрабаваць мяса. Тым часам ацец Комар пераехаў у Слонімскі павет у м. Дзятлава, і парафіяне аглядзеліся, што ў Далятыцкай царкве не хватае рызы. Праўда, тут няма нічога цікавага. бо ацец зрабіў паэвангельску „вока за вока, зуб за зуб“. Праз нейкі час прыехаў нейкі стары сьвяшчэньнік, і ізноў нешта ня клеілася. Нарэшцэ дачакаліся маладога сьвяшчэньніка айца Антона Сокал-Кутылоўскага. Чалавек здольны, „інжынер“, ахвіцэр, і не малага рангу, ды яшчэ штось-такое. Цікавіліся, чаму-ж гэта ён пакінуў масты будаваць, ды паперся да царквы? Прыехаўшы ў Далатычы сказаў, што вельмі ён бедны, а парафіяне паверылі і кінуліся памагаць хто чым мог. Але праз нейкі час гэты бедны зачаў купляць вяпрукі, калоць іх і гандляваць салам і вандлінаю. Толькі мабыць кепскі з яго быў гандляр, бо было чуваць, што скора прагандляваўся і пакінуў. Але гэта адносін з парафіянамі не папсавала; толькі калі ацец Антон прывёў кароўку пасьля пахаваньня аднае кабіты з вёскі Воўкаразі, дык парафіяне сталі прыглядацца к гэтаму „Сакалу“. Але жыцьцё не стаіць на мейсцы, скора ўсё забылася. Бяда толькі, што айца Кутылоўскага пачаў мабыць тачыць нейкі чарвяк, ці часам паветра Далятыцкае не спадабалася, бо ацец захацеў пераехаць на другую парафію і ізноў, як ацец Комар, папаў у Слонімскі павет, толькі ня ў Дзятлава, а ў вёску Накрышкі, побач з Дзятлавам. Парафіяне трохі пацмокалі, што не здалелі ўтрымаць „добрага“ бацюшку, ды нічога не парадзілі. Гэны добры бацюшка перавазіўся амаль ня два месяцы. Нарэшце, ў начы 19 верасьня зусім ад'яжджаў, праўда, толькі сям'я, сам ацец паехаў па два дні раней. Увечары 19 верасьня стараста царквы і раднік прыйшлі паглядзець, што ў доме сьвяшчэньніка асталося, бо былі прыналежныя да дому стол, шафа і яшчэ нешта, а на дварэ каля дому ляжалі дошкі царкоўныя; аж нічога гэтага няма. Запыталіся ў матушкі, і яна сказала, што нічога ня ведае, усё гэта бацюшка забраў. Пачалі далей аглядаць, ажно ў пограбе разбурана сьцяна цагляная, а цэглы няма. Тут каля дому сабралася грамада людзей і паднявўся гоман, як бы ваўка злавілі, дык і я пабег на гоман, аж не, гэта кажуць бацюшка „пазычыў“ прыналежныя да царквы рэчы. „Пазыка“ гэтым ня скончылася. У аднаго парафіяніна П. Клімовіча была да часу на зіму пазычана зялезная печка, дык ацец і яе павёз. Ня ведаю, можа паэвангельску гэтак дзякуюць, бо я чалавек ня вучоны.

Цяпер праз якісь час сядзім бяз бацюшкі, і ня вядаема, што зрабіць: і трэба бацюшку, і баімося, каб ня прыслалі якога „Мядзьведзева“, бо мядзьведзь дужэйшы за камара і сокала, дык болей пацягне.

Далятыцкі бадзяка.

Юрыдычныя парады.

П. Транчэўскаму:

Запытаньне: зямля надзельная і купленая. Са дня сьмерці бацькі прайшло 30 гадоў. Сястра 20 гадоў ня жыве з братам, а як сястра выяжджала ў места, брат даў ей грошы на дарогу. Міравы судзьдзя прысудзіў 14-ю часьць маемасьці сястры, а брат падаў апэляцыю ў вакружны суд, ці можна выйграць у вакружным судзе?

Адказ: Колькі гадоў мае сястра? Калі яна мае больш, як 30 гадоў, дык не павінна нічога атрымаць.

Як можа скончыцца справа ў вакружным судзе, наперад сказаць ня можна; усяляк бывае. Па закону, права на ўсю зямлю мае толькі брат, бо ў 1906—7, ён быў гаспадаром.

Усячына.

Каменем забіў-бы.

У вёсцы С. мітынг. Мяйсцовы абшарнік агітуе за польскую школу і пачынае высьмейваць беларускую мову, ды бэсьціць усяляк беларусаў. Прысутны на мітынгу беларускі вучыцель мяйсцовай школы спыняе зазнаўшагася аратата і грозіць яму судом за палбурэньне аднаго народу супраць другога. Чыноўнік прыціх, але тут пасьмялелі сяляне. Адзін з іх кажа, прыкінуўшыся нязнайкай:

— Панок, вось наш вучыцель, як кажа, дык мы знаем, што пабеларуску, а пан паякому гутара, дык нічога ня ўцямлю. А дзеж ужо нашым дзеткам такой мудрай гаворкі навучыцца?

Абшарнік успыліў:

— Павінны навучыцца, разумееш, быдла... Прэч стонд!

— А мой панок, кажа селянін — калі маё дзіця навучыцца так гутарыць са мной, як пан, дык я яго каменем забіў-бы! **М.**

Паштовая скрынка.

Міхалу Ватке, Прохару Земецу, Вінцуку Занемонцу, Аляксандру Дзеравянцы, Яну Топцы, Яну Дарашкевічу, Пятру Саковічу, Юоцы Маркевічу, Уладзімеру Лагодзе, Бартламею Шчукіну, М. Яс..., Мікалаю Трафімчыку, Мікалаю Діккерму, Міхалу Можэйко, Сьцяпану Борысэвічу, В. Войшэвічу, Вацлаву Рубкевічу, Аўгеньню Мамчыцу.—Ад ўсіх па 2 зл. атрымалі. Газэту высылаем. **Р. Безанкаму і Паўлу Вараве.** Па 3 зл. атрымалі. Газэту Вам высылаем. **М. Дожыну ў Амэрыцы.**—10 злотых за Вас атрымалі. Адрас папраўлены. **Д. Дожыну, Марку Ходзько, Язэпу Гарбатоўскаму, Сымону Томко** і А. К. ў Здалбунові. Па 5 зл. атрымалі. Газэту высылаем і Вам і па прыложаных адрасок. **Юльяну Асененку** 4 зл. атрымалі. Адрас, паводлуг Вашага жаданьня, перамененьі. **Уладзімеру Колядо** 4 зл. атрымалі. Кніжку вышлем. **Барысу Лукашуку, Ціхану Бухоўцу.** Па 6 зл. атрымалі. Кніжкі вышлем. **Язэпу Каспару.** 6 зл. атрымалі. Адкажа лістоўна. **Ф. Клаўсуцю.** 2 зл. атрымалі. Аддзел юрыдычны ў нашай газэце ёсьць і акуратным падпісчыкам парады даются бязплатна.

Рэдактар-Выдавец **Антон Войцік.** Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22.